ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МАГНАТАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

СВЯТЛАНА ПАЦЫЕНКА

***Анатацыя:*** Інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны магнатаў Вялікага Княства Літоўскага на сучасным этапе адлюстроўвае працэсы пераасэнсавання арыстакратычнай культуры і ўключэння яе ў сучасны сацыякультурны кантэкст. Прастора прыватнаўласніцкіх замкаў успрымаецца як неад'емная частка беларускай культуры, як месца лакалізацыі ўнікальнай гістарычнай інфармацыі.

***Ключавыя словы:*** магнаты, Вялікае Княства Літоўскае, інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны, культурная прастора замкаў, культурная ідэнтыфікацыя.

# SOME ASPECTS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA MAGNATES' CULTURAL HERITAGE INTERPRETATION

***Abstract:*** Interpretation of the cultural heritage of the magnates of the Grand Duchy of Lithuania at the present stage reflects the process of rethinking the aristocratic culture and its inclusion in the modern socio-cultural context. The cultural space of privately owned castles is perceived as an integral part of the Belarusian culture, and as a unique historical information site.

***Keywords:*** Magnates, Grand Duchy of Lithuania, Interpretation of Cultural Heritage, Castles' Cultural Space, Cultural Identity.

Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца ўстойлівай цікавасцю грамадства Беларусі да магнацкай спадчыны. Рэзідэнцыі вядомых арыстакратычных родаў, якія захаваліся да нашых дзён, маюць значны культурны патэнцыял і могуць прэтэндаваць на статус паўнавартасных нацыянальных сімвалаў. Актывізацыя цікавасці і зварот да духоўнай культуры менавіта элітарнай часткі грамадства дэманструе якасна новы ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускага грамадства. На дадзеным гістарычным этапе адбываецца пераасэнсаванне культурнай спадчыны арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага.

У сучаснай культуралогіі культурная спадчына разглядаецца як сукупнасць дасягненняў духоўнай культуры грамадства, увесь яго гістарычны вопыт, які ўключае як актуальныя кампаненты, так і такія, што пакуль не прыжыліся, але існуе магчымасць звароту да іх пазней. Большая частка культурных праграм з часам губляе сваю актуальнасць і паступова знікае з ужытку носьбітаў культуры альбо відазмяняецца ў працэсе ўсталявання новай сістэмы каштоўнасцей. Меншая частка такіх праграм пераходзіць з пакалення ў пакаленне, захоўваецца ў калектыўнай памяці чалавецтва ў якасці канстантнага інфарматыўнага ядра.

Выкарыстанне назапашанага папярэднімі пакаленнямі масіву ўзораў, каштоўнасцей, сімвалаў, сэнсаў культуры магчыма пры іх адаптацыі да актуальных умоў. Змены ў палітыцы, эканоміцы і іншых сферах сацыяльнага жыцця непазбежна выклікаюць неабходнасць мадэрнізацыі культурнага вопыту продкаў з мэтай выкарыстання яго ў адпаведнасці з новай сітуацыяй. На наш погляд, у сучасных умовах узмацнення глабалізацыйных працэсаў зварот да фундаментальных асноў культуры ўяўляе сабой альтэрнатыўны выбар вектараў развіцця. У сувязі з гэтым актуалізуецца значнасць багатай спадчыны арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага.

Значную ролю ў працэсе фарміравання духоўных каштоўнасцей адыгрываюць матэрыяльныя ўмовы. У гэтым кантэксце выклікае цікавасць прастора прыватнаўласніцкіх замкаў-рэзідэнцый – культурная спадчына магнатаў Вялікага Княства Літоўскага. Успрыманне замка, з аднаго боку, як цэнтра радавой гісторыі, а з іншага – як архітэктурнага аб'екта адлюстроўвае дуалізм духоўнага і матэрыяльнага пачаткаў, якія спалучыліся ў гэтым культурным феномене. Шматбаковасцю значэнняў дадзены архітэктурны аб'ект абавязаны таму, што, па словах Юрыя Лотмана, *"архітэктура складаецца не толькі з архітэктуры: вузка архітэктурныя канструкцыі знаходзяцца ў суадносінах з семіётыкай пазаархітэктурнага шэрага – рытуальнай, побытавай, рэлігійнай, міфалагічнай, – усёй сумай культурнага сімвалізму"* (Лотман, 2000).

Культурная прастора, што ствараецца ў працэсе чалавечай дзейнасці і аб'ядноўвае як матэрыяльныя артэфакты, спосабы іх вытворчасці, так і духоўныя ўзоры, сэнсы і гэтак далей, увасабляе каштоўнасна-сэнсавы змест пэўнай культуры. Стварэнне ўнікальнай культурнай прасторы – гэта спецыфічныя працэдуры фарміравання штучнага асяроддзя людзьмі, якія здзяйсняюцца ў адпаведнасці з нормамі і каштоўнасцямі канкрэтнай чалавечай супольнасці.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі размяшчалася значная колькасць буйных магнацкіх уладанняў. Увасабляючы светапоглядную парадыгму магнатаў, культурная прастора адлюстравала ўласцівую ім карціну свету, каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі, лад жыцця: архівы выступалі знакам старажытнасці паходжання, партрэтныя галерэі продкаў – высакародства, арсеналы, трафеі і зброя ў інтэр'ерах – вайсковай адвагі, скарбніцы – багацця, наяўнасць прыватных гарнізонаў – палітычнай незалежнасці і гэтак далей. Прастора прыватнаўласніцкіх замкаў аб'ядноўвала арыстакратаў з іх продкамі ў адзіным культурным полі магнацкага роду, спрыяла падтрыманню культу сямейных каранёў, забяспечвала трансляцыю радавых каштоўнасцей і традыцый у часе.

Сёння ў працэсе інтэрпрэтацыі культурнай спадчыны магнатаў узнікае шэраг праблем. Гістарычна склалася так, што ў беларускай культуры была страчана пераемнасць арыстакратычнай традыцыі. Нават даследаванне духоўнай культуры магнатаў з'яўляецца адносна новым кірункам у айчыннай культуралагічнай думцы. Спецыфіка гістарычных умоў існавання беларускіх зямель абумовіла адсутнасць грунтоўных навуковых прац па гісторыі культуры беларускай эліты. Знаходжанне тэрыторыі Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай, а потым Расійскай Імперыі садзейнічала таму, што дзейнасць уласна беларускай эліты асобна не вылучалася і разглядалася ў кантэксце польскіх альбо рускіх гісторыка-культурных працэсаў.

Папярэдняе вывучэнне духоўнай культуры магнатаў характарызавалася нераўнамернасцю даследавання розных яе аспектаў. Сярод фактараў, якія паўплывалі на дыферэнцыраванасць навуковага ўзроўню даследавання розных сфер духоўнай культуры, можна назваць абмежаванасць яе вывучэння ў савецкі перыяд па саслоўнай прыкмеце. У адпаведнасці з афіцыйнай пазіцыяй беларуская культура разглядалася як сялянска-мяшчанская, а яе фарміраванне і развіццё адбывалася ў кантэксце праваслаўя.

У апошнія дзесяцігоддзі XX–XXI стагоддзі цікавасць да культуры арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага, якая існавала на тэрыторыі сучаснай Беларусі, значна актывізавалася. Пацверджаннем гэтаму з'яўляецца шэраг публікацый беларускіх даследчыкаў, сярод якіх В. Ба-

жэнава, Г. Барвенава, А. Кілбас, А. Латушкін, А. Скеп'ян, аўтар дадзенай публікацыі і іншыя.

Сёння замкі з'яўляюцца адным з самых папулярных экскурсійных аб'ектаў у Беларусі. Аднак з прычыны дрэннага стану ў якасці рэальных музейных аб'ектаў можна разглядаць адзінкавыя архітэктурныя комплексы. Уключэнне адрэстаўраваных магнацкіх рэзідэнцый у сучасны сацыякультурны кантэкст павінна садзейнічаць культурнай ідэнтыфікацыі беларусаў. Багатая арыстакратычная спадчына, якая паўстае ва ўзноўленых замкавых сценах, насычана артэфактамі, напоўнена новымі знакамі і сэнсамі. Як адзначае літоўская даследчыца Раса Чэпайтэне, гістарычныя месцы *"могуць стаць матэрыяльным выяўленнем грамадскай ідэнтычнасці канкрэтнай групы, своеасаблівым культурным арыенцірам"* (Чепайтене, 2010). На наш погляд, на сучасным этапе існавання беларускага грамадства замкавая прастора выступае арыенцірам для далейшага культурнага развіцця.

Доўгі час дэклараваная як культура сялянская, сёння беларуская культура паступова пачала набываць новы сэнс. Існаванне на гэтай зямлі добра сфарміраванай і развітай арыстакратычнай культуры, якое пацвердзілася ўзноўленай прасторай прыватнаўласніцкіх замкаў-рэзідэнцый у Міры і Нясвіжы, змяніла вектар успрыняцця беларускай культуры.

У гэтым кантэксце відавочна праблема пошуку артэфактаў для напаўнення ўзноўленай замкавай прасторы. Падмена аўтэнтычных прадметаў муляжамі, копіямі, больш познімі ўзорамі пагражае фарміраваннем "падмененай, несапраўднай" ідэнтычнасці. Аднак, на жаль, на дадзеным этапе развіцця такі шлях бачыцца больш прадуктыўным, чым поўная адсутнасць экспанатаў.

Інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны магнатаў, а менавіта прасторы замкаў-рэзідэнцый, павінна зрабіць прыватнаўласніцкія замкі прасторай самавызначэння сучаснага беларуса, асяроддзем фармавання яго культурнай ідэнтыфікацыі. Раскрыццё сэнсаў архітэктурна-мастацкага і вобразнага характару замкавага асяроддзя спрыяе суаднясенню сучасным беларусам сябе з гістарычнай прасторай, садзейнічае яго культурнай і нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

### ***Бібліяграфія***

1. Лотман, Юрий (2000). *Семиосфера.* СПБ.: Искусство.
2. Чепайтене, Раса (2010). *Культурное наследие в глобальном мире.* Вильнюс: ЕГУ.